# Вельмі доўгі дзень

Даволі нечаканы візыт прэм'ер–міністра польскага ўраду Ганны Сухоцкай* у Менск зусім нечакана прымусіў мяне стаць урадавым перакладчыкам. Мая перакладчыцкая прыгода пачалася раніцай у сераду 18 лістапада 1992 г., калі на двух самалётах польская дэлегацыя паднялася ў паветра з вайсковага аэрадрому ў Варшаве.

Менск прывітаў нас сьнегам і парадам ганаровага ўзводу. Узвод выглядаў сюррэалістычна, маршыруючы пад бел–чырвона–белым сьцягам у сваіх савецкіх мундзірах і з зоркамі на вушанках, але што ж рабіць — не да такіх відовішчаў прывыклі мы апошнім часам.

Праца пачалася для мяне каля адзінаццатай гадзіны. Перакладаў я размовы польскай дэлегацыі пад кіраўніцтвам міністра па справах супрацоўніцтва з замежжам Анджэя Арандарскага зь беларускім бокам, які ўзначальваў міністар замежных спраў Пятро Краўчанка. Тлумачачы, я зразумеў, як цяжка ладзіцца супрацоўніцтва паміж дзьвюма дзяржавамі, якія дагэтуль практычна нічога супольнага ня мелі. Польшча проста баіцца, што зальюць яе тэрыторыю натоўпы былых савецкіх грамадзянаў, таму, напрыклад, адкрыцьця большай колькасьці прапускных пунктаў прыйдзецца пачакаць, прынамсі да таго часу, пакуль Беларусь не ўвядзе свае пашпарты. Затое не за гарамі беларускае консульства ў Беластоку.

Як міністар П. Краўчанка, так пасьля і прэм'ер–міністар Вячаслаў Кебіч не забываліся пра патрабаваньні беларусаў у Польшчы, перш за ўсё пра заканчэньне пабудовы Беларускага музэю ў Гайнаўцы і перадачы Супраскага манастыра праваслаўным. З боку сп. Г. Сухоцкай было дадзена абяцаньне парупіцца ў гэтым.

Лёгка і прыемна перакладаліся мне прамовы падчас абеду, які выдаў у гонар сп. Г. Сухоцкай сп. В. Кебіч, тым больш што ўсе стравы былі выдатныя.

Выдатнай была таксама атмасфэра куртуазнага візыту сп. Г. Сухоцкай у старшыні Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча, які вітаў польскую дэлегацыю ў кампаніі беларускіх парлямэнтарыяў, у тым ліку і з апазыцыі.

Пад канец пабыўкі ў Менску пачалося хваляваньне: паводле камунікатаў мэтэаслужбаў над Горадняй вісеў густы туман. Тым часам у Горадні чакалі сп. Г. Сухоцкую беларускія палякі. Усё ж такі прызямліліся мы шчасьліва. Вітаў сп. Г. Сухоцкую гаспадар Гарадзеншчыны старшыня аблвыканкаму Дзьмітрый Арцыменя. Пасьля візыту ў аблвыканкам польская прэм'ер–міністар апынулася ўжо ў руках сваіх суродзічаў зь Беларусі.

Спачатку наведала яна будынак Саюзу палякаў Беларусі (будан, але будуецца новая сядзіба), скуль пераехала ў гарадзенскі тэатар, дзе чакалі яе каля тысячы мясцовых палякаў. Хлебам–сольлю афіцыйна вітаў сп. Г. Сухоцкую старшыня Саюзу палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін. Былі сьпевы і патрыятычныя вершыкі, якія чыталі першаклясьнікі з польскіх школаў.

Сама сустрэча нічым не адрозьнівалася ад падобных сустрэчаў польскіх беларусаў з дастойнымі гасьцямі зь Беларусі. Ідэнтычныя няспынныя нараканьні на нястачу грошай, памяшканьняў і наагул на недастатковую зацікаўленасьць польскіх уладаў праблемамі палякаў у Беларусі.

У Варшаву вярнуліся мы пасьля адзінаццаці вечара. Цэлы дзень на нагах, амаль увесь час у напружаньні, ані хвіліны на адпачынак. Для гэтай палітыкі трэба мець конскае здароўе.

Што ж на канец? Візыт усьвядоміў мяне, як далёка нам яшчэ да нармальнага суседзтва і празрыстай мяжы, пра што мараць як беластоцкія беларусы, так і гарадзенскія палякі.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1992. 13 сьнежня. № 50. С. 1—2.

---

* Сухоцка (*Suchocka*) Ганна (нар. 1946) — польскі палітык, прэм'ер–міністар Польшчы зь 10 ліпеня 1992 г. па 18 кастрычніка 1993 г. — **Рэд.**